*Браў, писал, дзеці – дети, дзень – день, Дзіна – Дина.*

Калі слова будзе гучаць па-беларуску, падыміце сігнальную картку.

Важна, каб уменне вымаўляць гукавыя адзінкі выпрацоўвалася на матэрыяле выказванняў, якія маюць рэальны камунікатыўны сэнс. У ізаляваным стане беларускія школьнікі дастаткова легка вымаўляюць спецыфічныя гукі, чаго нельга сказаць пра звязную мову. У гэтым плане эфектыўнай будзе праца са скорагаворкамі, прыказкамі, прымаўкамі, рознымі звязнымі тэкстамі.

Знайдзіце словы з гукам [ч]. Прачытайце іх. Завучыце лічылку на памяць.

І чаму ты,
Кактус, злючы,
І чаму
Такі калючы?
Мне твае калючкі
Пакалолі ручкі.
*А. Дзеружынскі*

Знайдзіце словы з гукам [г], з гукам [ц']. Прачытайце іх. Прачытайце верш у асобах.

– Гусі, гусі...
– Га-га-га!
– Есці хочаце?
– Ага!
– Дык ляціце...
– Го-го-го...
Воўк зубаты за гарой.
– Гусі, гусі!
– Го-го-го...
– Вы не бойцеся яго!
*В. Коўтун*

У якасці камунікатыўных практыкаванняў на авалоданне арфаэпічнымі нормамі, фарміраванне трывалых вымаўленчых уменняў і навыкаў можна прапанаваць таксама:

запіс на магнітафон слоў, тэкстаў, якія начытваюць вучні, з наступным аналізам і ацэнкай іх вуснай мовы;

індывідуальнае і харавое прагаворванне гукаў, складоў, слоў, пры вымаўленні якіх магчымы памылкі;

выразнае чытанне тэксту з захаваннем арфаэпічных норм.

[1] Гл.: Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы. Мн., 1996. С. 126.
[2] Гл.: Выкладанне беларускай мовы ў школе / Пад рэд. М.Г.Яленскага. Мн., 1994.
[3] Гл.: Там жа. С.104.

*В.А. КАЛЯДА, С.У. МАКАРЭВІЧ*

## ТЭХНАЛОГІЯ ПАБУДОВЫ НАВУЧАЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ФІЗІЧНАМУ ВЫХАВАННЮ СТУДЭНТАЎ

Сучасная тэхналогія пабудовы працэсу фізічнага выхавання студэнтаў – гэта педагагічная дзейнасць, якая максімальна рэалізуе ў сабе высокія законы навучання, выхавання і развіцця асобы і таму забяспечвае яе канчатковыя вынікі[1].

Зыходным пунктам удасканалення навучальнага працэсу па фізічнаму выхаванню студэнтаў з'яўляецца спецыфіка, якая ўключае ў сябе, з аднаго боку, навучанне рухальным дзеянням, а з другога – фарміраванне адносін, уласцівых фізічнай культуры асобы.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У той жа час педагагічныя задачы асацыіруюцца з канцэпцыяй выхавання, накіраванай на фарміраванне дзейнасных узаемаадносін.

Дадзеная канцэпцыя зыходзіць з трактоўкі выхавання як мэтанакіраванага працэсу арганізацыі і стымулявання рознабаковай дзейнасці асобы навучэнца па авалоданню грамадскім вопытам: ведамі, практычным уменнем і навыкамі, спосабамі творчай дзейнасці, сацыяльнымі і духоўнымі адносінамі[2].

Акрамя спецыфічных адносін і канкрэтна-педагагічных задач фізічнага выхавання, істотную ролю адыгрываюць сацыяльныя і духоўныя адносіны, спосабы творчай дзейнасці, арганічна звязаныя з фізічным выхаваннем і фізічным развіццём чалавека.

Зыходзячы з адзначанага, фізічнае выхаванне неабходна разглядаць у вузкім і шырокім сэнсе. Гэта дазваляе выдзеліць у навучальна-выхаваўчым працэсе асобныя бакі цэласнага фізічнага выхавання.

У вузкім сэнсе фізічнае выхаванне мы разумеем як мэтанакіраваны працэс навучання і набыцця ведаў, рухальных уменняў і навыкаў, спецыфічных адносін у галіне фізічнай культуры і спорту. Пры стварэнні навучальных (рабочых) праграм спецыфіка фізічнага выхавання з'яўляецца асноўнай часткай вучэбнага матэрыялу, які прадугледжвае як авалоданне ведамі, рухальнымі ўменнямі і навыкамі, так і фарміраванне спецыфічных адносін: маральных, сацыяльных, эстэтычных пры выкарыстанні сродкаў фізічнага выхавання і спорту ў жыццёвай практыцы.

Асобае месца адводзіцца вызначэнню мэтавага кампанента фізічнага выхавання, які можа быць абагульняльным (шырокім, разгорнутым тыпу "Мэта фізічнага выхавання – садзейнічанне падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў") або канкрэтна-спецыфічным і ўваходзіць у галоўныя мэтавыя ўстаноўкі навучання і выхавання студэнта.

У шырокім сэнсе фізічнае выхаванне адлюстроўвае сукупнасць грамадскага вопыту, што дасягаецца сумесна з іншымі відамі дзейнасці. Адзіная і цэласная пабудова навучальнай праграмы на аснове арганічнага спалучэння спецыфічных норм і патрабаванняў фізічнага выхавання з шырокім спектрам духоўных, сацыяльных адносін, творчай і актыўна-пазнавальнай дзейнасцю абумоўлена агульнымі заканамернасцямі навучальна-выхаваўчага працэсу. На падставе шматгадовага практычнага вопыту работы па фізічнаму выхаванню, аналізу праграмнага матэрыялу і даследаванняў у дадзенай галіне прапануем выдзеліць у структуры навучальнага працэсу наступныя этапы:

1. Вызначэнне мэт і задач фізічнага выхавання.
2. Вызначэнне зместу матэрыялу, адэкватна рэальнаму ўзроўню фізічнага і функцыянальнага стану студэнтаў.
3. Арганізацыя навучальнага працэсу на аснове выпрацоўкі сістэмы спосабаў узаемадзеяння выкпадчык–студэнт на кожным этапе (курсе, семестры) фізічнага выхавання.
4. Забеспячэнне станоўчага эмацыянальнага фону і фарміраванне матывацыі ў занятках фізічным выхаваннем.
5. Кантроль, карэкцыя і рэгуляванне працэсу фізічнага выхавання.
6. Прымяненне традыцыйных і навейшых сродкаў і спосабаў удасканалення фізічнага выхавання.
7. Крытэрыі ацэнкі фізічнага выхавання па асноўных параметрах здароўя, фізічнага развіцця і фізічнай падрыхтаванасці.
8. Этапы (перыяды) засваення праграмнага матэрыялу студэнтамі.
9. Вызначэнне граніц дапушчальных адхіленняў у фізічным развіцці, падрыхтаванасці студэнтаў, аднесеных да спецыяльнай медыцынскай групы.
10. Дыферэнцыраванне фізічнага выхавання з улікам рэальных умоў і экалагічнага асяроддзя.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Абавязковай умовай рэалізацыі навучальнай праграмы з'яўляюцца агульнапедагагічныя і дыдактычныя прынцыпы навучання, звязаныя са спецыфікай. На наш погляд, найбольш істотныя і праблемныя ў навучальным працэсе дыдактычныя прынцыпы абгрунтоўваюцца наступнымі патрабаваннямі:

• рэальнасцю фізічнага выхавання ў адносінах да канкрэтных умоў вышэйшай навучальнай установы, рэгіёна;

• рознабаковасцю і светапоглядней накіраванасцю вывучэння курса фізічнага выхавання;

• фізкультурна-спартыўнай актыўнасцю і свядомасцю студэнта;

• грунтоўнасцю засваення ведаў, рухальных уменняў і навыкаў;

• даступнасцю навучання фізічным практыкаваннем, асабліва адэкватным узроўню фізічнага і функцыянальнага стану студэнта.

Не менш важнай умовай практычнай рэалізацыі праграмы па фізічнаму выхаванню з'яўляюцца патрабаванні, што прад'яўляюцца да кожнага канкрэтнага раздзела праграмы. Пры гэтым, у адпаведнасці з рэчаіснасцю, навучальная праграма можа быць скарэкціравана ў больш жорсткім рэжыме. Так, мэта фізічнага выхавання пры неабходнасці пераўтвараецца ў дыягнастычна-вызначальную, а этапы (семестры, курсы) навучання могуць суправаджацца сістэмай жорсткага кантролю за засваеннем матэрыялу.

Удасканаленне навучальнага працэсу па фізічнаму выхаванню студэнтаў звязана з пастаяннай распрацоўкай і ўкараненнем новых падыходаў да пабудовы праграмнага матэрыялу, арганізацыі заняткаў і крытэрыяў ацэнкі вынікаў фізічнага выхавання. Аб неабходнасці пошуку новых тэхналогій у фізічным выхаванні студэнтаў сведчаць істотныя недапрацоўкі шэрага праграмных дакументаў, большасць з якіх падпарадкавана агульным заканамернасцям фізічнага выхавання, без матываванага праектавання і пераўтварэння навучальнага працэсу, без мяркуемага канчатковага выніку, без уліку асобна арыентаваных умоў дзейнасці.

Названыя меркаванні дазваляюць выдзеліць найбольш значныя арганізацыйна-метадычныя бакі ўдасканалення фізічнага выхавання студэнтаў:

1. Рэгламентаванасць праграмнага навучальнага матэрыялу.

2. Рэальныя ўмовы арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу і спартыўнай падрыхтоўкі.

3. Узровень фізічнага здароўя, фізічнага стану студэнтаў на зыходным і наступных этапах (курсах, семестрах) навучання.

4. Дыягнастычна-вызначальныя мэты і задачы фізічнага выхавання ў кожным вучэбным падраздзяленні.

5. Карэкцыя сродкаў і метадаў выхавання з прымяненнем дастаткова жорсткага паэтапнага кантролю за асноўнымі параметрамі фізічнага выхавання.

6. Выкарыстанне эксперыментальных методык па вызначэнню колькасна-якасных характарыстык засваення навучальнага матэрыялу.

7. Распрацоўка і ўдасканаленне аб'ектыўных і адэкватных крытэрыяў ацэнкі фізічнага выхавання.

8. Сістэма спосабаў узаемадзеяння фізічнага выхавання з іншымі дысцыплінамі і відамі дзейнасці.

9. Удакладненне асноўных паняццяў сістэмы фізічнага выхавання студэнтаў, выкпадзеных у праграмных матэрыялах.

10. Канчатковы вынік фізічнага выхавання ў вышэйшай навучальнай установе.

З гэтага вынікае, што, нягледзячы на аб'ектыўную складанасць тэхналагічнай пабудовы навучальнага працэсу па фізічнаму выхаванню, пры ўмове захавання неабходных патрабаванняў, мы маем права гаварыць аб узбуйненні састаўных адзінак фізічнага выхавання і адпаведна паглыбленым усведамленні і засваенні навучальнага матэрыялу.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[1] Гл.: Праграма фізічнага выхавання студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Мн., 1992; Сласценін В.А. Дамінанта дзейнасці // Народная адукацыя. 1997. № 9. С. 41–42.
[2] Харламаў І.Ф. Педагогіка: навучальны дапаможнік. 3-е выд., перапрац. І дап. Мн., 1996. С. 81.

*Л.В. ХВЕДЧЕНЯ*

## ИДЕИ ГЛОБАЛИЗМА В ПОЛИТИКЕ СОВРЕМЕННОГО ИНОЯЗЫЧНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

К концу XX столетия философия образования подошла к осознанию "общепланетарного глобализма" как основополагающего направления современной гуманистической педагогики. Этому во многом способствовали кризис современной цивилизации, невозможность развиваться в прежних формах мировоззрения и мирохозяйствования. Кризис наглядно проявился в потоке трагедий социогенного и техногенного происхождения, в бездуховности и массовом снижении общей культуры. Потребительское отношение к природе привело к утрате *устойчивости мирового развития:* истощению ресурсов, загрязнению окружающей среды, нарушению коэволюции природы и общества[1], к угрозе термоядерной войны и другим глобальным проблемам. В связи с этим мировое сообщество пришло к необходимости перехода на новую модель развития, обеспечивающую гармонизацию отношений в системе "Человек – Социум – Природа"[2].

Новая цивилизационная эпоха прогнозируется как антропогенная и характеризуется переходом от *ЭГО-центризма* к *ЭКО-центризму*[3], т. е. исходит из признания человеком себя как части единой энергетической системы Вселенной. Человечество включено в эту систему в качестве духовно суверенной, но биологически зависимой микросистемы, поэтому проблема выживания состоит в том, чтобы "спасти себя от ее уничтожения"[4].

Говоря об ЭКО-центрической парадигме исторического развития, утверждающей неразрывную связь экологии природы, человека и культуры как важнейших факторов духовно-нравственной жизни общества, можно утверждать о необходимости перехода к новой *ЭКО-парадигме образования.* Уже самим своим названием ЭКО-образование предполагает тотальную экологизацию и глобализацию содержания и включает не столько технологические аспекты, сколько культурно-нравственные[5]. Это прежде всего формирование нового мировоззрения и глобального мышления, основанного на абсолютизации общечеловеческих ценностей и ведущего к сознательному воспитанию нового человека (homo moralis) – человека духовного, способного взять на себя ответственность за сохранение жизни на планете. Впервые в истории судьба человека поставлена в зависимость от уровня и качества образования, роль которого настолько велика, что XXI в. объявлен ЮНЕСКО "веком образования".

В свете сказанного глобализация содержания образования включает такие аспекты, как:

1) экологизация – создание дидактических условий для ценностно-ориентированного осознания учащимися проблем взаимосвязи человека и природы, формирования ощущения глобальности нашего бытия, постепенный перевод мышления на ноосферный уровень;

2) гуманизация – признание человека и системы общечеловеческих ценностей эпицентром всего учебно-воспитательного процесса и абсолютной самодовлеющей целью общественного развития;

3) культуроведческая социологизация – передача индивиду национальных и межнациональных культурных ценностей на основе сопоставительного изучения их влияния друг на друга, взаимодополняемости в мировом процессе развития общечеловеческой культуры[6];



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm